**Што такое адзінства?**

**Васільева Дар'я, вучаніца 11 «А» класа**
**ДУА «Гімназія № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска»**

Ведаеце, часцей за ўсё тыя думкі, якія прыходзяць да чалавека ўночы, прыносяць з сабой самыя складаныя пытанні – пытанні пра жыццё і яго сэнс.

Вось і зараз ноч. Перада мной на стале ляжыць кніга Івана Шамякіна «Сэрца на далоні». Яе шурпатая сіняя вокладка з серабрыстымі літарамі захоўвае на сабе сляды часу: гэта кніга з'явілася ў нашай хатняй бібліятэцы некалькі дзясяткаў гадоў таму. Я разгортваю пажаўцелыя, трохі пакамечаныя старонкі і адчуваю, быццам нешта аб'ядноўвае мяне з мінулым, звязвае з тымі, хто чытаў яе да мяне. Звязвае нават з самім Іванам Шамякіным.

Я даходжу да пятнаццатага раздзела рамана і перачытваю радкі, якія буду яшчэ не раз успамінаць: «Славік пачаў прабірацца наперад. На яго зашыкалі, каб не перашкаджаў слухаць. І ён не адважыўся хваляваць ціхае людское мора – застыў на месцы. Ён адчуў, усвядоміў веліч гэтага мора, яго магутную сілу. Разумную сілу, якая не разбурае, а стварае. І, можа, упершыню адчуў сябе часцінкай гэтай сілы».

«Часцінкай гэтай сілы, часцінкай чагосьці вялікага…» – я паўтараю гэтыя словы, якія, здаецца, назаўжды засталіся ўнутры мяне. І я пачынаю ўспамінаць...

У мінулым годзе я наведала святочны канцэрт у Палацы Рэспублікі, прысвечаны 105-годдзю з дня заснавання Усесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза моладзі і 60-годдзю ўтварэння студэнцкіх атрадаў. Я ўбачыла сотні маладых людзей, якія спявалі, танцавалі і паказвалі розныя свае таленты на вялізнай сцэне. Я бачыла іх і ў зале сярод гледачоў. Яны стаялі, абняўшы адно аднаго за плечы. Я бачыла ўсмешкі, я бачыла іскры ў вачах і самае галоўнае – я бачыла жыццё, якое кіпіць у гэтых маладых людзях. Я бачыла, як вырываецца з іх душ на волю жаданне жыць і тварыць. І я з нейкім прыемным хваляваннем і трапятаннем адчувала гэта ўсё і ў сабе. І тады зразумела, што я сярод іх таксама маленькая, але значная часцінка чагосьці вялікага. У той дзень здавалася, быццам уся моладзь Мінска сабралася ў адной зале і кожны з нас быў гэтай часцінкай – мы былі адзінствам.

А зараз успамінаю сябе на гімназічнай сцэне сярод сваіх сяброў, школьных знаёмых і педагогаў. І ўсе мы непадобныя адно да аднаго, рознага ўзросту, з рознымі інтарэсамі і розным светапоглядам. Але я ўпэўнена, што кожны, як і я, знаходзячыся там, адчуваў сябе прыналежным менавіта да гэтага моманту. Адчуваў сваю сувязь з усімі, хто быў побач. Мы таксама былі адзінствам. Адзінствам, якое выяўлялася ў нашым сяброўстве, у нашай творчасці, у любові да таго, што мы рабілі.

А зараз я ў думках пераношуся дадому, у момант, калі ўся мая сям'я збіраецца разам за вялікім сталом. А я сяджу з краю і слухаю апавяданні пра іх жыццё. Апавяданні аб тым, як выпадкова сустракаліся людзі з зусім розных гарадоў, і гэты шэраг выпадковых (а можа, і не выпадковых) сустрэч прывёў да таго, што цяпер жыву і я. І я ўсміхаюся. Усміхаюся, таму што ўсё паўтараецца: мы розныя, але мы разам. Усміхаюся, таму што адчуваю, што я

частка гэтай сям'і, а сям'я – гэта таксама адзінства. Адзінства не толькі плоці і крыві, але і адзінства традыцый, адзінства душ.

Я адпускаю ўспаміны, вяртаюся ў сучаснасць. І адчуваю, быццам з майго сэрца цягнуцца тоненькія нітачкі, якія звязваюць мяне з рознымі людзьмі. Атрымліваецца, я сама ёсць гэтае адзінства ўсіх тых, каго сустракала, адзінства тых, з кім сябрую, каго люблю. Адзінства тых, чые думкі і словы пакінулі ўнутры мяне асаблівы след.

Дык што ж такое гэта «адзінства»? Гэта гармонія. Гэта ўсведамленне, што ты не самотны. Гэта адчуванне сябе той самай «часцінкай вялікай сілы», мэта якой – будаваць далейшае жыццё.

І маё самае патаемнае жаданне – гэта каб розныя людзі аб'ядноўваліся для здзяйснення добрых спраў. Аб'ядноўваліся, каб рабіць наш свет лепшым.

Ужо вельмі позна і трэба загортваць кнігу і рыхтавацца да сустрэчы з новым днём. Але перад тым, як заснуць, я звярнуся да Бога з малітвай, што, нібы вольны вецер, нібы песня, вырываецца з майго сэрца:

Я не прашу цябе,
Божа, пра многае.
Хачу толькі, каб мае
словы пайшлі,
Паляцелі далёка-
далёка і
Каб адчулі іх усе на
Зямлі:

«Людзі, яднайцеся
(чуеце
Мае вы няхітрыя
словы?)
У сяброўстве,
каханні. Падумайце!
Так дабро мы ў свеце
створым!

Людзі, вы, калі ласка,
яднайцеся
У дапамозе, у
спагадзе. Хутчэй!
Ад варожасці вы
пазбаўляйцеся –
Будзе больш тут
шчаслівых вачэй!

Вы яднайцеся, Людзі,
мілыя,
У нязломным
жаданні ствараць.
На зямлі, што пад
белымі крыламі,
Будзем разам жыццё
будаваць».

Я не прашу цябе,
Божа, пра многае.
Толькі словы мае
перадай
Людзям усім, што
жывуць там, далёка,
Праз раку і бярозавы
гай.

«Вы пачуйце мяне – я
маліла,
Бо мы разам, і гэта
дар».
І я веру: у адзінстве
сіла,
У адзінстве душы,
добрых мар.